У.П. Бастракоў,
эксперт у вобласці развіцця інфармацыйных сістэм

# Роля інфармацыйнай сістэмы «Інтэграваны банк даных устаноў культуры» ў інфармацыйна-метадычным забеспячэнні дзейнасці кіраўнікоў і спецыялістаў сферы культуры

Асаблівасцю навучання ў сістэме дадатковай адукацыі дарослых у галіне культуры з’яўляецца павышэнне не толькі прафесійных ведаў навучэнца, але і ведаў аб прадметнай вобласці яго дзейнасці і канкрэтнага аб’екта, з якім ён мае ці будзе мець справу ў сваёй практычнай дзейнасці. Галіна культуры ў гэтых адносінах — складаная структура з разнастайнымі напрамкамі дзейнасці і аб’ектамі, якія рэалізуюць гэтую дзейнасць. Найбольш рацыянальна і поўна сабраць, сканцэнтраваць і падтрымліваць у актуальным стане гэтыя веды, а таксама данесці іх да слухачоў сёння магчыма з выкарыстаннем сучасных інфармацыйна-тэлекамунікацыйных тэхналогій (ІТТ) [2]. У галіне культуры гэтыя магчымасці рэалізаваны інфармацыйнай сістэмай «Інтэграваны банк даных устаноў культуры» (ІБДУК), якая вызначана як адзіная крыніца даных аб колькасці, рэсурсах, сетках арганізацый і ўстаноў галіны і выкарыстоўваецца пры прыняцці рашэнняў, правядзенні аналітычных і даследчых работ. ІБДУК з’яўляецца і асновай атрымання актуальных ведаў у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, навучанні рэзерву кіруючых кадраў.

Асноўнымі функцыямі банка даных з’яўляюцца:

стварэнне і вядзенне рэспубліканскіх і рэгіянальных інфармацыйных рэсурсаў аб стане і дзейнасці ўстаноў культуры;

маніторынг напрамкаў дзейнасці, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, стану інфраструктуры сетак устаноў культуры;

фарміраванне дзяржаўных статыстычных справаздач па нецэнтралізаваных статыстычных назіраннях устаноў культуры;

аператыўнае інфармацыйнае абслугоўванне прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях кіравання сеткамі ўстаноў культуры;

правядзенне аналітычных работ і даследаванняў у галіне культуры;

інфармацыйнае забеспячэнне падрыхтоўкі спецыялістаў галіны.

Карыстальнікамі ІБДУК з’яўляюцца дзяржаўныя і рэгіянальныя органы кіравання, установы адукацыі і навуковыя арганізацыі, кіраўнікі і спецыялісты галіны.

ІБДУК уяўляе сабой тэрытарыяльна размеркаваную і іерархічна арганізаваную сістэму, кампаненты якой размяшчаюцца па ўсёй тэрыторыі рэспублікі [3].

Іерархічна ўзроўні банка даных размяркоўваюцца наступным чынам:

першасны ўзровень (установы галіны);

базавы (раён, горад);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгіянальны (вобласць, г. Мінск);

рэспубліканскі (Міністэрства культуры).

Структурнымі кампанентамі інтэграванага банка даных на іерархічных узроўнях з'яўляюцца:

на першасным узроўні — праграмна-інфармацыйныя комплексы «Установа» (ПІКУ) і інтэграваныя банкі даных цэнтральных[1] устаноў культуры;

на базавым узроўні — інтэграваныя банкі даных устаноў культуры раёна, горада;

на рэгіянальным узроўні — інтэграваныя банкі даных устаноў культуры абласцей і г. Мінск;

на рэспубліканскім узроўні — цэнтральны інтэграваны банк даных устаноў культуры (ЦІБДУК).

Інтэграваныя базы даных структурных кампанентаў ІБДУК з'яўляюцца інфармацыйным рэсурсам[2] базавага, рэгіянальнага, рэспубліканскага ўзроўняў. Прыём інфармацыі адбываецца па тэлекамунікацыйных каналах.

На схеме 1 прыведзены знешнія інфармацыйныя сувязі ЦІБДУК.




Схема. 1. Знешнія сувязі цэнтральнага інтэграванага банка даных устаноў культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Пад цэнтральнай установай разумеецца ўстанова, якая мае ў сваім складзе адасобленыя структурныя падраздзяленні (філіялы, аддзелы, сектары).

[2] Інфармацыйны рэсурс — арганізаваная сукупнасць дакументаванай інфармацыі, якая ўключае базы даных, іншыя сукупнасці ўзаемазвязанай інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах.

Фарміраванне асноўнага інфармацыйнага рэсурсу ІБДУК — галіновай інтэграванай базы даных праводзіцца на аснове інтэграваных баз даных рэгіёнаў (абласцей і г. Мінск) і праграмна-інфармацыйных комплексаў рэспубліканскіх устаноў. Абнаўленне інфармацыі адбываецца штоквартальна.

Асноўнымі рэгулярнымі карыстальнікамі ІБДУК з'яўляюцца цэнтральны апарат Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ), Інбелкульт, Белстат. Па запытах ажыццяўляецца абслугоўванне дзяржаўных органаў, Нацыянальнай акадэміі навук, устаноў вышэйшай адукацыі краіны, іншых ведамстваў арганізацый галіны.

У сістэме дадатковай адукацыі дарослых ІБДУК выкарыстоўваецца ў дзвюх функцыях: як аб'ект вывучэння і як адзін з кампанентаў інфармацыйнага забеспячэння і дзейнасці ў сферы культуры. Як аб'ект вывучэння ён вызначаны для ўключэння ў адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў і спецыялістаў галіны. Як крыніца фактычнай і статыстычнай інфармацыі аб сферы культуры ён выкарыстоўваецца пры правядзенні круглых сталоў, пасяджэнняў з кіраўнікамі і спецыялістамі бібліятэк, клубаў, музеяў, кіруючых органаў, падрыхтоўцы аналітычнай інфармацыі для ўстаноў культуры.

Асноўныя формы абслугоўвання — прадастаўленне і абнаўленне карыстальніцкіх версій інтэграванай базы даных (КВ ІБД), разлік і прадастаўленне пакетаў рэгулярных аператыўных і статыстычных электронных справаздач, інфармацыйнае абслугоўванне па аператыўных запытах, выкананне аналітычных і даследчых работ па заданнях і інш.

Карыстальніцкія версіі забяспечваюць апрацоўку базы даных у поўным аб'ёме, акрамя змены структуры базы даных і значэння даных. У такіх версіях недаступныя змены сродкаў апрацоўкі і фарміравання выхадных дакументаў. Гэтыя версіі могуць ствараца як у поўным аб'ёме галіновай інтэграванай базы даных, так і па пэўнаму тыпу ўстаноў культуры. Да прыкладу, для НББ ствараецца карыстальніцкая версія інтэграванай базы даных публічных бібліятэк рэспублікі (КВ ІБДПБ).

Карыстальніцкія версіі вядуцца, як і аб'яднаная інфармацыйная база даных (АІБД), у квартальным цыкле.

Праз ІБДУК фарміруюцца каля 100 відаў справаздач. Кожная справаздача ўяўляе сабой электронны дакумент пэўнай формы. Параметры разліку і сам разлік робяцца ў інтэрактыўным рэжыме. Шэраг справаздач (25 у квартальным цыкле і 45 у гадавым) прадастаўляюцца карыстальнікам у выглядзе рэгулярных квартальных і гадавых электронных пакетаў. Справаздачы ўтрымліваюць зводныя паказчыкі па рэсурсах і дзейнасці сетак устаноў за справаздачны перыяд.

Зводная інфармацыя па стану сетак устаноў культуры ў справаздачы даецца на дату абнаўлення базы даных (канец справаздачнага перыяду). Абнаўленне ІБДУК і фарміраванне справаздач праводзіцца кожны квартал, што дазваляе значна павысіць аператыўнасць бягучага кіравання, пераклаўшы яго з гадавога цыкла на квартальны, скараціць аб'ём дзелавой перапіскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На аснове АІБД штогод фарміруюцца справаздачы па дзяржаўных статыстычных назіраннях за найбольш масавымі ўстановамі культуры — публічнымі бібліятэкамі і клубамі, якія складаюць 83 % устаноў галіны. Гэта дазваляе скарачаць штогадовы дакументаабарот галіны амаль на 30 тыс. лістоў, тэрміны фарміравання справаздач — у 2—3 разы, цэнтралізаваць і вызваляць ад гадавой статыстычнай справаздачнасці ўстановы, што скарачае працаёмкасць больш чым на 8 тыс. чал./г.

У складзе ІБДУК створана і функцыянуе інфармацыйна-аналітычная сістэма (ІАС). Яна дазваляе весці дынамічныя аналітычныя назіранні сетак устаноў культуры ў розных маштабах часу, што забяспечвае магчымасць не толькі бачыць фактычны стан аб'екта ва ўсталяванай часовай кропцы, але і «назіраць за яго паводзінамі», вызначаць тэндэнцыі і характарыстыкі яго развіцця, што вельмі цяжка і працаёмка ў традыцыйных фактаграфічных статыстычных сістэмах.

Усе работы ў ІБДУК праводзяцца ў інтэрактыўным рэжыме, што дазваляе выкарыстоўваць яго ў адукацыйным працэсе непасрэдна пры правядзенні заняткаў у аўдыторыі з аўтаматызаваным працоўным месцам з выхадам у лакальную сетку Інбелкульта.

Інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС) ІБДУК забяспечвае пошук і атрыманне інфармацыі аб любой установе, занесенай у базу даных: яе тытульных і кантактных даных, стане інфраструктуры, кіруючым саставе, штатнай і спісачнай колькасці працоўных рэсурсаў, колькасці абсталявання, паказчыках дзейнасці.

ІПС ІБДУК выканана ў фармаце электроннай карты. Асноўным прызначэннем ІПС з'яўляецца пошук і прагляд інфармацыі аб аб'екце. Пошук пачынаецца націсканнем на контур вобласці, пасля чаго адкрываецца карта вобласці з выявай раёнаў, затым указваюцца раён, тып установы і ажыццяўляецца выбар патрэбнай установы са сфарміраванага спісу і прагляд даных аб ёй. Даныя ў поўным аб'ёме ўтрымліваюцца ў пашпарце і інфармацыйных картах. Даведачная інфармацыя падаецца згодна з адлюстраванай на экране.

Інфармацыйна-аналітычная сістэма (ІАС) ІБДУК прызначана для выканання наступных функцый:

вядзенне рэгулярных дынамічных назіранняў галіны культуры з мэтай выяўлення тэндэнцый і прагназавання развіцця;

правядзенне тэматычных даследчых і аналітычных работ;

рашэнне слабафармалізаваных задач;

фарміраванне спісаў, пералікаў і інш.

Вядзенне рэгулярных дынамічных справаздач на аснове ІАС ІБДУК дазваляе перайсці ад працаёмкіх і вельмі нязручных у практычнай рабоце метадаў апрацоўкі статыстычных даных да сучасных высокапрадукцыйных інфармацыйных тэхналогій з выкарыстаннем электронных табліц і камп'ютарнай дзелавой графікі, што робіць справаздачы больш поўнымі і нагляднымі, значна павышае эфектыўнасць работы аналітыкаў і магчымасць правядзення даследаванняў, у разы скарачае працаёмкасць і тэрміны публікацыі электронных дакументаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На аснове ІАС у Інбелкульце распрацаваны і штогод папаўняецца данымі электронны інфармацыйна-аналітычны зборнік «Культура культуры ў лічбах» [1], які з'яўляецца і ў практычнай дзейнасці, і ў адукацыйным працэсе асноўнай крыніцай даных аб сетках устаноў культуры, дзейнасці і рэсурсах галіны.

Матэрыялы прадстаўлены ў фармаце электронных табліц, дыяграм, графікаў пачынаючы з 2008 г. і штогод дапаўняюцца па выніках мінулага года.

На аснове аналізу дадзеных рыхтуюцца аналітычныя матэрыялы і для навуковых выданняў [4; 5].

Выкарыстанне ІБДУК у сістэме ДАД, па-першае, дае магчымасць кіраўнікам і спецыялістам авалодаць сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, комплексным падыходам і сістэмным аналізам, па-другое, забяспечвае адукацыйны працэс актуальнымі данымі аб стане і развіцці сферы культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Бастракоў, У.П.* Галіна культуры ў лічбах [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://inbelkult.by/by/uncategorized/87-galina-kultury. — Дата доступу : 14.07.2016.
2. *Бастраков, В.* Информационная модель отрасли культуры / Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 12—13 чэрвеня 2012 г.) / рэдкал.: І.І. Крук (гал. рэд.), А.А. Галкін, І.Р. Голубева. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2012. — С. 292—295.
3. *Бастраков, В., Березовская, Г., Голоборщенко, В.* Интегрированный банк данных учреждений культуры / Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 12—13 чэрвеня 2012 г.) / рэдкал.: І.І. Крук (гал. рэд.), А.А. Галкін, І.Р. Голубева. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2012. — С. 296—301.
4. *Бастракоў, У.П.* Статыстычны аналіз дзейнасці ўстаноў галіны культуры за 1991 — 2010 гг. / Культура Беларусі: 20 год развіцця (1991—2011): [манаграфія] / С.П. Вінакурава [і інш.] ; навук. рэд. І.І. Крук. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2012. — С. 279—321.
5. *Бастракоў, У.П.* Асноўныя паказчыкі развіцця арганізацый культуры ў 2011—2015 гг. / Беларуская культура — 2015 : стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця [электроннае выданне] / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ДУА «Інстытут культуры Беларусі» ; уклад. : А.Р. Гуляева, І.Б. Лапцёнак ; рэдкал.: Б.У. Святлоў (старш.) [і інш.]. — Мінск : Інбелкульт, 2016. — 319 с.